Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ліпеня 2024 г.
СУБОТА
№ 145 (30279)



РАЗАМ СУПРАЦЬ НАСТУПСТВАЎ СТЫХІІ 2




ЧАГО ЧАКАЦЬ АД ВЫСТУПЛЕННЯЎ АЛІМПІЙЦАЎ? 7

# ЛАВАНДАВАЕ ЛЕТА КАЛЯ ВЕТКІ



**Не, гэта не Праванс на фота. Дакладней, Праванс, толькі наш, Гомельскі. Менавіта так называецца лавандавая ферма побач з вёскай Рудня-Спoніцкая Веткаўскага раёна. Гэтае месца заўсёды прыцягвае знатакоў прыгажосці ў французскім стылі. Нядаўна гэты пункт прыцягнення ўключылі ў турыстычныя маршруты па Беларусі. Убачыць на свае вочы лавандавыя прасторы, удыхнуць ні з чым непараўнальны водар, зрабіць некалькі кадраў на памяць і павезці невялікі букецік з сабой — з такой місіяй сюды прыбываюць і расійскія турысты. Час цвіцення — усяго некалькі тыдняў, таму многія спяшаюцца, каб застаць бязмежныя прасторы лаванды. Зрэшты, на ферме вырошчваюць больш за 50 відаў раслін, таму цікавасць да гэтага месца не знікае. У гадавальніку — дэкаратыўныя, пладовыя і ягадныя культуры.**

**Фота БелТА.**

## СУР'ЁЗНЫЯ РАЗМОВЫ Ў НЕФАРМАЛЬНАЙ АБСТАНОЎЦЫ

**Учора прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прадоўжылі размаўляць у нефармальнай абстаноўцы на востраве Валаам у Карэліі.**

Кіраўнікі дзяржаў сустрэліся на Валааме ў чацвер. Яны доўга размаўлялі сам-насам у нефармальнай абстаноўцы, але абмяркоўвалі ў тым ліку самыя сур'ёзныя пытанні. Учора размова працягнулася. У цэнтры ўвагі — міжнародны і рэгіянальны парадак дня, беларуска-расійскае супрацоўніцтва, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Сацыяльны вектар

## Вырасце памер бюджэту пражытачнага мінімуму, а разам з ім дапамогі і пенсіі

### Што мяняецца са жніўня?

**З 1 жніўня вырастуць памеры дапамог па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў і іншыя дапамогі на дзяцей, а таксама даплаты да пенсій, дапамогі па догляду інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, сацыяльныя пенсіі.**

### Падрастуць дапамогі на дзяцей да трох гадоў

Як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, з 1 жніўня змяняюцца памеры дапамог па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, якія разлічваюцца зыходзячы з сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў у краіне за II квартал 2024 года (СЗП).

Такім чынам, з 1 жніўня памеры дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў будуць павялічаны на 7,3 працэнта.

Дапамога на першае дзіця павялічыцца на 53 рублі і складзе 777,81 рубля (35 % СЗП). На другога і наступных дзяцей дапамога вырасце на 60,5 рубля да 888,92 рубля (40 % СЗП). На дзіця-інваліда павышэнне складзе 68,1 рубля, дапамога будзе выплачвацца ў памеры 1 000,04 рубля (45 % СЗП).

У такіх памерах дапамога па догляду дзіцяці да трох гадоў будзе дзейнічаць з 1 жніўня 2024 года па 31 студзеня 2025 года.

### Павялічваецца памер БПМ

Акрамя таго, з 1 жніўня 2024 года павялічваецца памер бюджэту пражытачнага мінімуму. Новы памер БПМ будзе дзейнічаць да 31 кастрычніка бягучага года.

БПМ у сярэднім на душу насельніцтва ў параўнанні з яго значэннем, устаноўленым з 1 мая, павялічыцца на 3,4 % і складзе 433 рублі. Для працаздольнага насельніцтва БПМ разлічаны ў памеры 462,26 рубля, пенсіянераў — 314,13 рубля, дзяцей да трох гадоў — 273,78 рубля, дзяцей ад трох да шасці гадоў — 365,55 рубля, дзяцей ад шасці да 18 гадоў — 428,23 рубля.

У сувязі са змяненнем БПМ аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, даплаты да пенсій, дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, а таксама сацыяльныя пенсіі.

Апошняя ў жніўні вырасце да 216,5 рубля (цяпер 209,37 рубля). Сацыяльная пенсія інвалідам I групы , у тым ліку інвалідам з дзяцінства, складзе 476,3 рубля (460,6 рубля цяпер), інвалідам з дзяцінства II групы — 411,35 рубля (497,79 рубля), інвалідам другой групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства), дзецям у выпадку страты кармільца — 368,05 рубля (355,92 рубля).

### Павысяцца ўзроставыя даплаты да пенсій

Узроставыя даплаты да пенсій атрымліваюць больш за 527 тысяч чалавек ва ўзросце 75 гадоў і старэйшых. Памер гэтых выплат павялічыцца на 3,4 % і для асоб ва ўзросце 75—79 гадоў складзе 81,19 рубля, 80 гадоў і старэйшых (з улікам надбаўкі на догляд) — 162,38 рубля, а пры наяўнасці інваліднасці I групы — 216,5 рубля.

Выдаткі на «ўзроставыя даплаты» ў 2024 годзе складуць, па папярэдняй ацэнцы, 790 мільёнаў рублёў.

### Паднімуць дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей

З 1 жніўня на 3,4 працэнта павялічваюцца і памеры дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Гэта датычыцца выплат, якія вылічаюцца з БПМ. СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЛІНЕВІЧ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У перыяд уборачных работ тактычныя хады вызначаюць першачарговую ўборку таго або іншага віду збожжа — ячменю, пшаніцы або рапсу. На ўсё свой час, але трэба да кожнай культуры падыходзіць асабліва, таму што яна мае ўласцівасць у выніку асыпацца. Напрыклад, патрапіць пад дождж, які яе абаб'е, і страцім ураджай. Тактыка — сабраць тое, што хутчэй за ўсё можаш страціць. На гэта трэба быць нацэленымі, і кожны кіраўнік павінен тактычна вызначыць для сябе, што ён кожны дзень павінен убіраць. Адзін з важных момантаў — уборка палегласцяў на палях пасля непагадзі. З году ў год у нас праходзяць ліўні, шквалісты вецер, бывае град. Да гэтага трэба быць гатовымі — проста нармальна, па-гаспадарску выбудаваць сістэму сваёй працы падчас уборачнай кампаніі. Прагноз такі: пры наяўнасці добрага надвор'я два тыдні — і ўраджай можна ўвесь практычна сабраць».*

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ 1943 - 1944

## НА АПОШНІХ РУБЯЖАХ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

### Паўднёвая частка Брэстчыны была вызвалена ў самым канцы ліпеня

**У пачатку месяца свабоднымі ад фашысцкай навалы ўжо былі сталіца, усе абласныя гарады, а тут працягваліся жорсткія баі, гінулі людзі. На вызваленне цяперашняй тэрыторыі Брэстчыны спатрэбілася больш чым тры тыдні. Але ж усе ведалі: Чырвоная Армія на падыходзе, вораг адсоўваецца на захад.** СТАР. 3



Ускладанне кветак да помніка ў Маларыце.

Актуальна

## Больш за 700 новых аўтобусаў, 100 тралейбусаў, а таксама каля 70 электробусаў

### Так сёлета абновіцца аўтапарк краіны

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Мінтранса Рыгор ГЛАЗКО лічыць, што развіццё дарожнай гаспадаркі з'яўляецца неад'емнай часткай перадавога руху ўсяго транспартнага комплексу. А стан аўтамабільных дарог аказвае самы непасрэдны ўплыў на сацыяльна-эканамічныя аспекты развіцця нашай дзяржавы, аўтатранспарту, рэнтабельнасць.**

### ШЧЫЛЬНАСЦЬ ДАРОГ — НА МАКСІМУМЕ, ЦЯПЕР СПРАВА ЗА ЯКАСЦЮ

Паводле яго слоў, па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання перавозіцца больш за 40 % усіх грузаў і каля 60 % пасажыраў. Рыгор Глазко дадаў, што па стане на 1 студзеня працягласць аўтамабільных дарог агульнага карыстання ў Беларусі складае каля 87 тысяч кіламетраў. З іх па рэспубліканскай сетцы — каля 16 тысяч кіламетраў, а па мясцовай — каля 71 тысячы кіламетраў.

«На аўтамабільных дарогах агульнага карыстання маецца каля 5220 маставых збудаванняў. Адзначу, што шчыльнасць сеткі аўтамабільных дарог агульнага карыстання нашай краіны адна з самых высокіх сярод краін постсавецкай прасторы і ў цэлым у Еўропе. СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МУС Францыі паведаміла аб росце злачыннасці каля алімпійскіх аб'ектаў



Французскія праваахоўныя органы зафіксавалі павелічэнне колькасці злачынстваў, у тым ліку нападзенняў і крадзяжоў, побач з алімпійскімі аб'ектамі ў рэгіёне Іль-дэ-Франс. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на статыстычную службу (SSMSI) МУС Францыі. Згодна з дакументам, колькасць абраз прадстаўнікоў улады і нападаў на іх у гэтых раёнах павялічылася на 20 працэнтаў у параўнанні з папярэднім тыднем. Таксама на 12 працэнтаў узрасла колькасць крадзяжоў з ужываннем гвалту, на 11 працэнтаў часцей адбываліся бойкі. На тры працэнты часцей зафіксаваліся выпадкі ўжывання наркотыкаў. У дакладзе падкрэсліваецца, што гэтыя лічбы не з'яўляюцца канчатковымі і могуць быць пазней перагледжаны, паколькі скаргі не заўсёды падаюцца адразу пасля ўчынення злачынстваў.

### Маск заявіў аб пагрозе банкруцтва ЗША

Злучаным Штатам пагражае банкруцтва. Пра гэта папярэдзіў Ілан Маск, паведамляе ТАСС. «Дарэчы кажучы, Амерыка банкруціцца», — напісаў ён у сацсетцы. Такім чынам мільярдэр пракаментаваў інфармацыю аб тым, што выплаты працэнтаў па дзярждоўгу ЗША ў 2024 годзе складуць $1,14 трлн і што на іх спатрэбіцца 76 % усіх падаходных падаткаў. У пачатку студзеня дзярждоўг ЗША перавысіў адзнаку $34 трлн. За 2023 год ён вырас больш як на $4 трлн. Прэзідэнт краіны Джо Байдэн падпісаў 3 чэрвеня мінулага года адобраны раней Кангрэсам законапраект аб павышэнні столі дзяржаўнага доўгу. Цяпер ліміт будзе дасягнуты 2 студзеня 2025 года.



ISSN 1990 - 763X

### У Японіі больш як 200 тысяч чалавек атрымалі прадпісанні аб эвакуацыі з-за ліўняў



Удакладняецца, што прадпісанні атрымалі больш чым 75 тысяч жыхароў прэфектур Ямагата і Акіта, а таксама каля 140 тысяч жыхароў прэфектуры Міягі. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя рэгіянальных улад. У паўночна-ўсходняй частцы Японіі працягваюцца магутныя залевы, за суткі ў некаторых рэгіёнах узровень ападкаў дасягнуў амаль 40 сантыметраў. Паводле апошніх звестак, як мінімум чатыры чалавекі прапалі без вестак, у тым ліку два супрацоўнікі паліцыі ў прэфектуры Ямагата. Там ратавальнікі знайшлі толькі патрульны аўтамабіль, які перакуліўся і ўграз на адной з мясцовых дарог. Як папярэдзілі японскія метэаролагі, моцныя дажджы на паўночным усходзе і поўначы краіны будуць ісці яшчэ некалькі дзён. Выратавальныя службы ўказваюць на пагрозу разліву рэк і апоўзняў, заклікаючы жыхароў, якія атрымалі адпаведнае прадпісанне, перамясціцца ў спецыяльныя эвакуацыйныя цэнтры.

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў гандлёвай галіны Рэспублікі Беларусь з прафесійным святам і 100-годдзем з дня ўтварэння органаў гандлю Беларусі.
- **Экспарт МТЗ і «Гомсельмаша» ў Расію падтрымаюць з бюджэту. Гэта прадугледжана ўказам кіраўніка дзяржавы ад 24 ліпеня 2024 года нумар 303.**
- Гарачая лінія па пытаннях збору дзяцей у школы пачала працаваць у Мінадукацыі. Нумар тэлефона гарачай лініі: 8 (017) 222-43-12. Час працы: 26 ліпеня — з 15.00 да 18.00, з 29 ліпеня па 2 жніўня — з 15.00 да 18.00.
- **Імёны 18 ураджэнцаў Беларусі, якія загінулі ў Другой сусветнай вайне, з'явіліся на мемарыяле ў Нарвегіі.**
- На заводзе ў Баранавічах да 2038 года вырабяць не менш як 89 самалётаў «Асвей».

Спажывец

## НАЗАПАСІМ ВІТАМІНЫ

### Шукаем сезонныя гародніну, садавіну і ягады ў фермераў і ў краме

**Лета — час «жывых вітамінаў» непасрэдна з градкі або з галінкі, якія мы павінны паспець назапасіць на доўгія восень і зіму. Зрабіць гэта можна па-рознаму. Даведаемся пра коштавы дыяпазон сярэдзіны гэтага лета на самую простую і «хадавую» сезонную агародніну і садавіну, а таксама ягады.**

І для пачатку адправімся на фермерскі рынак Валяр'янава. Высветлім, ці сапраўды тут усё так дарага, як прынята лічыць?

### З ПРЫСТАЎКАЙ «ЭКА»

Гандлёвы комплекс «Валяр'янава» пазіцыяніруе сябе як экарынак: экалагічна чыстую гародніну, садавіну, мяса і «малочку» фермеры прывозяць сюды з усёй краіны. У будны дзень раніцай у гандлёвых залах прыгожа і нешматлюдна: прылаўкі вабяць фарбамі, а пакупнікоў няшмат. Але, сцвярджаюць прадаўцы, з другой паловы пятніцы і ўсе выхадныя на недахоп попыту скардзіцца не даводзіцца: якасць гарантуе продажы. СТАР. 8



Наталля прапануе пакупнікам дзясяткі розных сартоў таматаў.